# Абапіраючыся на асабісты вопыт

Вельмі важным з'яўляецца вызначэнне сродкаў і прыёмаў, з дапамогай якіх можна паспяхова ўздзейнічаць на пачуцці і свядомасць вучняў, у выніку чаго ў дзяцей выпрацоўваюцца крытэрыі для ацэнкі ўчынкаў сваіх сучаснікаў і ўласных. Вопыт гісторыі дапамагае ў маральнай ацэнцы рэчаіснасці, якая акружае нас. Вучань неўсвядомлена карэкціруе свае паводзіны, кіруючыся прыкладам пачутага: "А што зрабіў бы я на іх месцы?" Гэтае пытанне дзеці задаюць самі сабе. Яны ставяць сябе перад маральным выбарам.

Будучыня ў многім вызначаецца тым, якую моладзь мы выхаваем сёння. У сувязі з гэтым вельмі важныя задачы па грамадзянскім, патрыятычным выхаванні стаяць перад школай, якая павінна прывіваць вучням пачуццё любові да Радзімы, калектывізму, павагі да старэйшых, бацькоў і настаўнікаў, выхоўваць падрастаючае пакаленне ў духу высокай адказнасці за якасць вучобы і працы, за свае паводзіны, развіваць вучнёўскае самакіраванне. Поспех грамадзянскага, патрыятычнага выхавання становіцца больш плённым, калі вучні прымаюць актыўны ўдзел у акцыі "Вахта Памяці".

Менавіта ў перыяд навучання ў пачатковай школе дзеці пачынаюць актыўна засвойваць маральныя нормы паводзін чалавека, грамадзяніна, далучаюцца да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, удзельнічаючы ў акцыі "Ветэран жыве побач".

Паэтапнае ўключэнне малодшых школьнікаў у жыццё соцыуму ажыццяўляецца праз культурна-гістарычнае асяроддзе вёскі, што прадугледжвае распрацоўку заняткаў па краязнаўстве і гісторыі вёскі, удзел у акцыі "Ачысцім планету ад смецця".

Грамадзянскае выхаванне малодшых школьнікаў можа быць эфектыўным толькі пры ўмове апоры на асабісты вопыт дзяцей, што прадугледжвае зварот да рэальнай палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай рэчаіснасці, яе супярэчнасцей і тэндэнцый развіцця. Без сувязі з рэальным жыццём можа сфарміравацца чыста акадэмічная сістэма ведаў, але побач з ёй у свядомасці навучэнцаў будзе існаваць іншая сістэма ўяўленняў і адносін, якая супадае з іх жыццёвым вопытам.

**Галіна МАЗУРА,**
**настаўніца пачатковых класаў Кемялішкаўскага ясляў-сада — сярэдняй школы Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці.**